сопровождали трудящихся от дома до заводских цехов, культивировались сытость и довольство жизни. Монументальные картины изображали Сталина и его соратников на фоне городов, воинов Красной Армии, роскошные портреты передовиков производства, пионеров, девушек-спортсменок. В красных уголках висели копии живописных полотен, среди которых картина художника И. Лукомского «Заседание парткома», на которой изображено человек 10 активистов, и они жестко прорабатывают провинившегося работника. Областной центр еще мог наслаждаться шедеврами советской культуры. Ее уровень и масштабы в регионах были на порядок ниже по массовости и качеству. Волны репрессий накатывались периодически на ее талантливых представителей, от уцелевших требовали творить в духе генеральной линии партии. Такой видится многогранная культурная жизнь в Могилеве в канун страшной трагедии.

Литература и источники:

1.Национальный архив Республики Беларусь. – Ф.4. – Оп 3. – Д. 1215.
2.Государственный архив общественных объединений Могилевской области. – Ф. 9. – Оп. 1а. – Д. 179.
3.Память: Гіст-дакум. хроніка Магілева. / Беларус. Энцыклап.: Г.П. Пашкоў (гал.рэд.). – Мн.: БелЭн, 1998. – 496 с. іл.
4.Камунар Магілеушчыны. – 1941. – 1 мая.
5.Камунар Магілеушчыны. – 1941. – 14 чэрв.

С.У. Грыбава (Брэст, Беларусь)

## БЕЛАРУСКІЯ ТАТАРЫ Ў СКЛАДЗЕ ПАРТЫЗАНСКІХ ФАРМІРАВАННЯЎ УСХОДНІХ АБЛАСЦЕЙ БССР ПАДЧАС ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Нацыянальны склад барацьбітоў супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на Беларусі падчас Вялікай Айчыннай вайны быў вельмі разнастайны. Прадстаўнікі больш за 70 нацыянальнасцей змагаліся ў радах партызан на беларускіх землях. Сярод іх былі і мясцовыя татары, ураджэнцы Беларусі, якія разам з іншымі таксама неслі ўвесь цяжар партызанскага жыцця. Дадзены артыкул прысвечаны антыфашысцкай барацьбе беларускіх татараў у складзе партызанскіх фарміраванняў усходніх абласцей БССР (па адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму падзелу на 1.01.1941 г.). Дарэчы, паводле перапісу 1939 г. колькасць татарскага насельніцтва ў БССР на 17 студзеня 1939 г. складала 3731 чалавек. Гістарычна склалася так, што рэгіянальная лакалізацыя татараў у дадзеным рэгіёне была абмежавана тэрыторыяй Мінскай вобласці [1, с. 70–71].

Падчас Вялікай Айчыннай вайны вялі барацьбу з ворагам мясцовыя татары ў складзе партызанскіх фарміраванняў **Мінскай вобласці**, якія ўваходзілі ў групоўку партызанскіх брыгад Мінскай зоны. Найбольшая іх колькасць была прадстаўлена ў 1-й Мінскай партызанскай брыгадзе, якая дзейнічала ў Чэрвеньскім, Мінскім, Пухавіцкім і Рудзенскім раёнах. У яе складзе змагаліся 800 беларусаў, 252 рускія, 62 украінцы. У шэрагах адзначанага вайсковага фарміравання вялі барацьбу з ворагам і 48 прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей [2, с. 487]. Па падліках аўтара, дзве трэці з іх складалі

беларускія татары. Амаль што ўсе яны з’яўляліся ўраджэнцамі Смілавіч. Гэта можна патлумачыць тым, што рэгіён дзейнасці брыгады ахопліваў Рудзенскі раён, пасля адміністрацыйнай рэформы 1960 г. – Чэрвеньскі раён Мінскай вобласці, дзе і зараз размяшчаецца гэта адно з буйнейшых паселішчаў татараў на тэрыторыі Беларусі. Былі прадстаўлены татары і ў іншых партызанскіх фарміраваннях, якія ўваходзілі ў групоўку партызанскіх брыгад Мінскай зоны: у атрадзе імя С.М. Кірава *брыгады імя С.М. Кірава* (дзейнічала ў Червеньскім, Барысаўскім, Рудзенскім і Пухавіцкім раёнах) [3, л. 21а], у атрадзе «Перамога» *брыгады імя Газеты «Праўда»* (дзейнічала ў Чэрвеньскім раёне) [4, л. 80–81].

Удзельнічалі ў антыфашысцкай барацьбе беларускія татары і ў складзе партызанскіх фарміраванняў злучэння Барысаўска-Бягомльскай зоны Мінскай вобласці, а менавіта ў партызанскім атрадзе імя А.В. Суворава і атрадзе імя Р.І Катоўскага *брыгады «Народныя мсціўцы»* імя В.Т. Варанянскага (дзейнічала ў Плешчаніцкім і Лагойскім раёнах) [5, л. 90], у 1-м і 5-м атрадах *брыгады «Жалязняк»* [6, л. 14, 101, 141, 143] (дзейнічала ў Бягомльскім і Лагойскім раёнах), у *1-й Антыфашысцкай брыгадзе* (дзейнічала ў Барысаўскім, Лагойскім, Плешчаніцкім раёнах Мінскай вобласці, Куранецкім, Плісікім, Пастаўскім раёнах Вілейскай вобласці, Лепельскім, Ушацкім раёнах Віцебскай вобласці) [7, л. 30–31, 66, 170], у атрадзе імя М.І. Калініна *брыгады імя М.І. Калініна* (дзейнічала ў Плешчаніцкім раёне) [8, л. 37–38], у атрадзе імя Г.К. Жукава і ў атрадзе «Грозны» *брыгады «Штурмавая»* (дзейнічала ў Заслаўскім, Лагойскім і Мінскім раёнах Мінскай вобласці, Радашковіцкім раёне Вілейскай вобласці), у атрадзе «За Айчыну» *брыгады «Дзядзькі Колі»* (дзейнічала ў Барысаўскім, Смалявіцкім, Бягомльскім, Лагойскім, Плешчаніцкім раёнах), у атрадзе імя С.М. Будзёнага *Лагойскай брыгады «Бальшавік»* [9, л. 418]. Змагаліся беларускія татары і ў складзе фарміраванняў партызанскага злучэння Мінскай вобласці (Паўднёвай зоны Мінскай вобласці): *у 3-й Мінскай партызанскай брыгадзе імя С.М. Будзёнага* (дзейнічала ў Пухавіцкім, Рудзенскім, Мінскім і Старадарожскім раёнах) [10, л. 7], у *брыгадзе «Беларусь»* (дзейнічала ў Рудзенскім і Пухавіцкім раёнах) [11, л. 25], у атрадзе імя Р.І. Катоўскага *300-й брыгады імя К.Е. Варашылава* (дзейнічала ў Дзяржынскім, Уздзенскім, Капыльскім, Краснаслабоцкім раёнах Мінскай вобласці і Нясвіжскім раёне Баранавіцкай вобласці) [12, л. 20], у атрадзе імя В.І. Чапаева *27-й брыгады імя В.І. Чапаева* [13, л. 41–42, 52, 270] (дзейнічала ў Капыльскім, Грэскім раёнах Мінскай вобласці і Нясвіжскім, Клецкім раёнах Баранавіцкай вобласці), а таксама ў асобным атрадзе імя А.В. Суворава [14, л. 1, 8].

Змагаліся беларускія татары супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў і ў складзе іншых партызанскіх фарміраванняў, якія дзейнічалі ва ўсходніх абласцях БССР. У партызанскіх фарміраваннях **Магілёўскай вобласці** яны былі прадстаўлены ў мінімальнай колькасці. Вялі барацьбу з ворагам у *208-м асобным партызанскім палку імя І.В. Сталіна Магілёўскай і Пінскай абласцей.* [15, л. 40]. Полк дзейнічаў у Клічаўскім, Кіраўскім раёнах Магілёўскай вобласці, Крупскім раёне Мінскай, Рагачоўскім раёне Гомельскай, Целяханскім і Ганцавіцкім раёнах Пінскай абласцей.

У партызанскіх фарміраваннях **Віцебскай вобласці** беларускія татары змагаліся з ворагам у складзе атрада імя С.М. Кірава *брыгады імя С.М. Кароткіна*, якая дзейнічала ў Сіроцінскім, Расонскім, Полацкім, Ушацкім раёнах Віцебскай вобласці і Пліскім і Міёрскім раёнах Вілейскай вобласці [16, л. 96–97], а таксама ў атрадзе № 20 «Бальшавік» *брыгады імя А.Ф. Данукалава* («Аляксея») (дзейнічала ў Касплянскім раёне Смаленскай, Лёзненскім, Суражскім, Віцебскім, Аршанскім, Багушэўскім, Бешанковіцкім, Чашніцкім, Ушацкім раёнах Віцебскай і Пліскім раёне Вілейскай абласцей) [17, л. 233].

У партызанскія атрады татары былі залічаны ў асноўным летам-восенню 1943 г. Да ўступлення ў шэрагі партызан пэўная частка татарскага насельніцтва выконвала функцыю сувязных партызанскіх фарміраванняў ці мела дачыненне да падпольнай працы. Працавалі татары да ўдзелу ў партызанскім руху і на прамысловых прадпрыемствах ці ў сельскай гаспадарцы. Некаторыя прадстаўнікі беларускіх татараў знаходзіліся ў складзе 1-й Рускай нацыянальнай брыгады СС Рускай вызваленчай арміі (РВА) пад камандаваннем былога савецкага падпалкоўніка У.У. Гіля, які меў псеўданім Радыёнаў. І ў складзе гэтый брыгады (Гіль-Радыёнава) перайшлі 16 жніўня 1943 г. на бок партызан. Брыгада атрымала назву 1-я Антыфашысцкая, дзейнічала ў Мінскай вобласці.

Можна таксама прывесці прыклады пэўнай пераверфбоўкі савецкімі органамі татарскага насельніцтва. Так, сувязным 3-й Мінскай брыгады імя С.М. Будзёнага быў татарын з в. Сенніца Мінскага раёна Якаў Хасяневіч. Нарадзіўся ён 12.02.1902 г. у м. Смілавічы Мінскай вобласці. Скончыў Мінскае рэальнае вучылішча, навучаўся на завочным аддзяленні Мінскага педагагічнага інстытута, дзе атрымаў спецыяльнасць настаўніка гісторыі. З верасня 1921 г. да студзеня 1938 г. працаваў настаўнікам і дырэктарам Логава-Слабодскай школы. З 7 студзеня 1938 г. выконваў функцыі завуча і настаўніка сярэдняй школы ў в. Сенніца. Меў узнагароды ад савецкай улады. У ваенны час школа не працавала. У складзе яго сям'і былі жонка Марыя, маці і чацвёра яго дзяцей [18, л. 4, 4 зв.].

Да перапісу насельніцтва, які па загаду Мінскай раённай управы было неабходна правесці па валасцях раёна да 1 кастрычніка 1943 г., у кожнай воласці прыцягваўся настаўнік непрацуючай школы з выразным почыркам [19, л. 57]. У Сенніцкай воласці адказным акупацыйнымі ўладамі быў прызначаны менавіта Я.З. Хасяневіч. Дарэчы, у Дзяржаўным архіве Мінскай вобласці захаваўся пратакол Сенніцкай валаснай управы Мінскага раёна ад 22 мая 1942 г., дзе зафіксаваны выбар сябраў камітэта пранямецкай БНС. Адным з іх быў вызначаны Якаў Зянонавіч Хасяневіч [20, л. 18]. Аднак 1 снежня 1943 г. ён даў падпіску асобаму аддзелу НКУС аб супрацоўніцтве. Пры перадачы звестак у пісьмовай форме ён павінен быў карыстацца псеўданімам «Тэлефон» [21, л. 6].

Па сацыяльным становішчы ў сваёй большасці татары ў партызанскіх фарміраваннях ўсходніх абласцей БССР былі рабочымі (малюнак 1). Калі весці размову аб партыйным членстве татараў-партызан, то асноўная маса была беспартыйнай.




**Малюнак 1 – Сацыяльнае становішча татараў у партызанскіх фарміраваннях усходніх абласцей БССР**

Што датычыцца ўзроўня адукацыі прадстаўнікоў татарскага насельніцтва ў складзе партызанскіх фарміраванняў усходніх абласцей, то большая колькасць з іх мела няпоўную сярэднюю ці сярэднюю адукацыю, значная частка мела пачатковую адукацыю (малюнак 2).




**Малюнак 2 – Узровень адукацыі татараў у партызанскіх фарміраваннях усходніх абласцей БССР**

Значная большасць татараў партызанскіх фарміраванняў усходніх абласцей удзельнічала ў баявых аперацыях, частка выконвала функцыю сувязных, яшчэ менш татараў было ў гаспадарчых узводах, адзінкі – у разведцы. Камандзірскіх пасад яны не займалі.

Такім чынам, татары ў партызанскіх фарміраваннях усходніх абласцей БССР змагаліся з ворагам у складзе 19 атрадаў 16 партызанскіх брыгад, у 1 асобным палку і 1 асобным атрадзе. З усіх усходніх абласцей больш за ўсё беларускіх татараў было ў партызанскіх злучэннях Мінскай вобласці, таксама татары змагаліся ў складзе партызанскіх фарміраванняў Магілёўскай і Віцебскай абласцей. У партызанскіх брыгадах Палескай і Гомельскай абласцей яны адсутнічалі. Прадстаўніцтва татарскага насельніцтва ў складзе партызанскіх фарміраванняў усходніх абласцей Беларусі залежала ад гісторыка-геаграфічнага размяшчэння татарскіх абшчын на дадзенай тэрыторыі і ад тэрытарыяльнага ахопу рэгіёна дзеяння брыгад.

Колькасць беларускіх татараў у партызанскіх фарміраваннях усходніх абласцей Беларусі выглядае наступным чынам: па падліках аўтара, каля 2 % з іх (ці

каля 70 чалавек) прымалі ўдзел у партызанскім руху. Прадстаўнікі дадзенага этнасу, якія прымалі ўдзел у партызанскім руху, аддана змагаліся з ворагам, некаторыя былі адзначаны шэрагам узнагарод. Ёсць прыклады ўдзелу ў антыфашысцкай барацьбе цэлых татарскіх сем'яў.

Літаратура і крыніцы:


1. Всесоюзная перепись населения 1939 года. Основные итоги / под ред. Ю.А. Полякова. – М. : Наука, 1992. – 256 с.
2. Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны 1941 – 1944 гг. / А.Л. Манаенков [ и др.]. – Минск : Беларусь, 1983. – 764 с.
3. Отряд им. С.М. Кирова бригады им. С.М. Кирова, Минская обл. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 53.
4. Список личного состава бригады им. Газеты «Правда» Минской области (август 1943 г. – 1944 г.) // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 2. – Спр. 405.
5. Бригада «Народные мстители» им. В.Т. Воронянского, Минская обл. (1941 г. – 29 мая 1945 г.) // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 97.
6. Бригада «Железняк» Минской области (1942 г. – 10 июля 1945 г.) // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 192.
7. 1-я Антифашистская бригада Минской области // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 331.
8. Списки личного состава бригады им. М.И. Калинина Минской области // НАРБ. – Фонд 1405. – Воп. 1. – Спр. 1112.
9. Бригада «Большевик», Минская область // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 50.
10. 3-я Минская бригада им. С.М. Буденного, Минская обл. (1941–1944 гг.) // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 421.
11. Бригада «Беларусь», Минская область // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 6. – Спр. 17.
12. Бригада им. К.Е. Ворошилова, Минская обл. (1941 г. – 20 августа 1945 гг.) // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 151.
13. Бригада им. В.И. Чапаева, Минская и Белостокская обл. (1941–1944 гг.) // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 165.
14. Отдельный отряд им. А.В. Суворова, Минская обл. (1942–1944 гг.) // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 273.
15. 208-й отдельный полк им. И.В. Сталина, Могилевская и Пинская обл. (1941–1944 гг.) // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 135.
16. Список личного состава бригады им. С.М. Короткина Витебской области (июль – август 1944 г.) // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 2. – Спр. 225.
17. 15-й «Сокол», 16-й «Комсомолец», 17-й «Мститель», 20-й «Большевик» отряды бригады им. А.Ф. Данукалова, Витебская обл. (9 сентября 1942 г. – 15 ноября 1944 г.) // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 199.
18. Подписки агентуры 3-й Минской партизанской бригады (1 декабря 1943г. – 13 декабря 1944 г.) // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 2. – Спр. 128.
19. Переписка с волостными управами о розыске граждан, предоставлении списков командиров Красной Армии, офицеров бывшей царской армии, заготовке и вывозке дров, сдаче книг записей актов гражданского состояния, переписи населения (25.01.1943 г. – 23.06.1944 г.) // Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (ДАМВ). – Фонд 623. – Воп. 1. – Спр. 512.
20. Протоколы заседаний комитета Белорусской народной самопомощи, списки руководителей и членов волостных отделов БНС, списки, анкеты и автобиографии старост по деревням волостей за 1942 г. (01.02. – 14.09.1942 г.) // ДАМВ. – Фонд 623. – Воп. 1. – Спр. 204.

21. Подписки агентуры 3-й Минской партизанской бригады (1 декабря 1943г. – 13 декабря 1944 г.) // НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 2. – Спр. 128.

Е.А. Ковалев (Минск, Беларусь)

## КЛАДБИЩА КАК ПРЕДМЕТ ИЗУЧЕНИЯ ПРИ ИССЛЕДОВАНИИ ИСТОРИИ И КУЛЬТУРЫ НАЦИОНАЛЬНЫХ МЕНЬШИНСТВ НА ТЕРРИТОРИИ ОТСЕЛЕННЫХ ДЕРЕВЕНЬ ЧЕРНОБЫЛЬСКОЙ ЗОНЫ

Зона отчуждения и отселения Чернобыльской АЭС – территория вокруг Чернобыльской АЭС, с которой в 1986 г. было эвакуировано население. Данное определение применимо к части площадей 10 районов Гомельской и 6 районов Могилевской области, из которых в 1986–1991 гг. эвакуировано более 100 тысяч человек [3, с. 276]. Исторически так сложилось, что данная территория Беларуси являлась местом проживания не только жителей титульной нации, но и представителей других народов – поляков, евреев, русских, украинцев, немцев, чехов, латышей и др. По данным 1926 г. из 7075 немецких поселенцев проживавших в БССР, 3294 человека приходилось на сельскую местность Мозырьского Полесья. Основными пунктами их проживания являлись колонии Березовка, Антоновка, Майдан, Красиловка, Осиповка, Хатки, Дуброва, Анзельмовка [2, с 12]. За исключением последнего, все выше перечисленные населенные пункты перестали существовать после Чернобыльской аварии. Подобная ситуация также складывается вокруг бывших старообрядческих слобод на территории Ветковского района [1, с. 295–311]. Одним из крупнейших мест расселения лиц чешской национальности в начале XX в., являлась деревня Чехи в Микуличской волости Речицкого уезда (Хойникский район), которая сегодня входит в состав Полесского радиационно-экологического заповедника [2, с. 16]. Таким образом, при изучении национального разнообразия в современном белорусском обществе невозможно обойти вниманием малые диаспоры, представители которых проживали ранее в границах сегодняшнего «чернобыльского» пространства.

Коренное население и национальные диаспоры, находясь в тесных социально-экономических и одинаковых политических условиях, оказывали друг на друга значительное культурное влияние. Результаты этого диалога национальных культур можно наблюдать в различных сферах материальной и духовной культуры. Таким образом, изучение истории существования малых диаспор, является важной частью исследования культурного наследия отселенных территорий. Но отселение жителей и следующие за этим миграционные процессы, значительно осложняет исследование истории межэтнического взаимодействия на данных территориях, сокращая источниковедческую базу. Материальные свидетельства деятельности человека, в которых могут отражаться культурные особенности, в пространстве зоны отчуждения или не сохранились, либо продолжают стремительно разрушаться под влиянием природных факторов. Поэтому единственными полноценными источниками по изучению истории и культуры представителей национальных меньшинств, проживавших ранее на территории, которая ныне входит в состав зоны отчуждения и отселения, являются архивные материалы.